Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Мякіннік добра ведае праблемы, з якімі да яго могуць прыйсці людзі, і чым мясцовая ўлада можа ім дапамагчы ў вырашэнні той ці іншай сітуацыі. МС

На Барысаглебскія могілкі з'язджаюцца вернікі з усяго свету. Тут наўпрост з зямлі растуць каменныя крыжы, якія, кажуць, валодаюць цудадзейнай сілай... СТАР.4

Заслаўе кіеўскі князь Уладзімір пабудаваў для свайго сына Ізяслава і жонкі Рагнеды. Сімвалічна, што менавіта тут прайшоў фестываль праваслаўнай моладзі, прысвечаны 1025-годдзю Хрышчэння Русі. СТАР.6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІПЕНЯ 2013 г. СЕРАДА № 130 (27495) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«ДАРОЖНАЯ КАРТА» БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА НАБЫВАЕ НОВУЮ ЯКАСЦЬ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапануе выпрацаваць новую «дарожную карту» беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Пра гэта ён заявіў учора на перамовах са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.



Фота БЕЛТА.

«Вы вельмі дакладна сёння сказалі пра тое, што мы выходзім на новую прыступку нашых адносін, прыступку стратэгічнага партнёрства. Для гэтага трэба выпрацаваць на перспектыву новую праграму — «дарожную карту». Гэта тое, што нам сёння трэба. І я ўпэўнены, што да канца года нашы ведамствы, урады змогуць прапанаваць такую праграму далейшага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і КНР», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падзякаваў Сі Цзіньпіну за запрашэнне наведаць Кітай, а таксама за гасціннасць, аказанную беларускай дэлегацыі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў вялікую адкрытасць і змястоўнасць двухбаковых перамоў, якія кіраўнікі дзяржаў правялі ў вузкім складзе. «Асаблівасць цяперашніх перамоў, якія занадта зацягнуліся ў вузкім складзе, але былі на карысць нашым адносінам, складаецца ў тым, што яны носяць беспрэцэдэнтную адкрытасць», — адзначыў беларускі лідар.

У сваю чаргу Старшыня КНР Сі Цзіньпін заявіў, што адносіны Кітая і Беларусі выйшлі на беспрэцэдэнтна высокі ўзровень. Паводле яго слоў, «нашы адносіны няўхільна развіваюцца, пераадольваючы прыступкі адну за адной. Зараз яны фактычна выйшлі на беспрэцэдэнтна высокі ўзровень. Наступіў новы этап імклівага развіцця двухбаковых адносін». Сі Цзіньпін падкрэсліў, што беларускі Прэзідэнт з'яўляецца вялікім сябрам кітайскага народа. «Вы ўнеслі вялікі ўклад у развіццё кітайска-беларускіх адносін. У гэты гістарычны момант, калі нашы адносіны выходзяць на якасна новы этап развіцця, ваш візіт, я ўпэўнены, абавязкова надасць дадатковы стымул далейшаму двухбаковаму развіццю супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», — сказаў Старшыня КНР.

Кітайскі лідар таксама адзначыў, што ў ходзе перамоў з кіраўніком беларускай дзяржавы ў вузкім складзе бакі грунтоўна абмяняліся думкамі па розных пытаннях двухбаковых адносін і дасягнулі шмат якіх важных дамоўленасцяў.

Па выніках перамоў кіраўнікоў дзвюх краін была падпісана сумесная дэкларацыя.

У сумеснай дэкларацыі заяўлена аб рашэнні ўсталяваць адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і гатоўнасці працягваць умацаванне палітычнага ўзаемадаверу, актывізаваць каардынацыю і ўзаемадзеянне ва ўсіх сферах, паглыбляць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, нарошчваць гуманітарныя сувязі, а таксама кантакты па лініі грамадскасці. «Бакі маюць намер распрацаваць Праграму развіцця адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства паміж Беларуссю і КНР», — гаворыцца ў дакуменце.

Беларусь і Кітай таксама дамовіліся нарошчваць кантакты на вышэйшым, высокім і іншых узроўнях, актывізаваць сувязі і супрацоўніцтва па лініі заканадаўчых органаў дзвюх краін, пашыраць і паглыбляць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва.

У дакуменце падкрэсліваецца, што рашучая ўзаемная падтрымка і цеснае ўзаемадзеянне па пытаннях, якія закранаюць дзяржаўную незалежнасць, суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць, інтарэсы нацыянальнай бяспекі і развіцця, з'яўляюцца важным складнікам усебаковага стратэгічнага партнёрства.

Беларускі бок зноў пацвердзіў сваю прыхільнасць да палітыкі «аднаго Кітая» і прызнае, што ўрад КНР з'яўляецца адзіным законным урадам, які прадстаўляе ўвесь Кітай, а Тайвань — неад'емная частка тэрыторыі Кітая. «Беларускі бок выступае супраць «незалежнасці Тайваня» ў якой бы там ні было форме, не наладжвае з Тайванем афіцыйных адносін і не падтрымлівае з ім афіцыйных кантактаў, выступае супраць уступлення Тайваня ў любыя міжнародныя і рэгіянальныя арганізацыі, членамі якіх могуць быць толькі суверэнныя дзяржавы, не пастаўляе зброі Тайваню, падтрымлівае мірнае развіццё адносін паміж двума берагамі Тайваньскага праліва і ўсе намаганні ўрада Кітая, нацэленыя на аб'яднанне дзяржавы», — гаворыцца ў тэксце сумеснай дэкларацыі.

У сваю чаргу кітайскі бок пацвердзіў, што з разуменнем і павагай ставіцца да незалежнай унутранай і знешняй палітыкі, якая праводзіцца Рэспублікай Беларусь, і выбранага краінай шляху развіцця, падтрымлівае намаганні Беларусі, накіраваныя на абарону дзяржаўнай незалежнасці, суверэнітэту, забеспячэнне сацыяльна-палітычнай стабільнасці і развіццё народнай гаспадаркі, выступае супраць знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы Беларусі па якой бы там ні было прычыне.

У дэкларацыі адзначаецца, што краевугольным каменем кітайска-беларускага супрацоўніцтва з'яўляецца эканамічнае ўзаемадзеянне, у тым ліку гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае. Бакі дамовіліся прымаць дзейсныя меры па нарошчванні маштабу гандлю, паляпшэнні гандлёвай структуры, павышэнні ў ёй долі прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю і высокатэхналагічнай прадукцыі.

ТРАВЫ-АБЯРЭГІ

Фота БЕЛТА.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Экстракт» (у Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці) вырошчвае каля 40 відаў лекавых траў і кустоў. «Экстракт» займаецца развядзеннем і вырошчваннем насення і расады, якую затым рэалізуе іншым прадпрыемствам. Жэньшэнь, эхінацея, лекавы рамонак, календула, мята, валяр'яна і многае іншае расце на доследным участку прадпрыемства. На здымку: збор календулы.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ІАСУБ, фінансавы аналітык:

«Нацбанк зрабіў больш жорсткай грашова-крэдытную палітыку пры праяве негатыўных тэндэнцый на фінансавым рынку. На працягу першага паўгоддзя некалькі разоў знижалася стаўка рэфінансавання, праводзілася змякчэнне гэтай палітыкі. Але пасля кожнага з такіх крокаў Нацбанк назірае за рэакцыяй эканомікі. У прыватнасці, у чэрвені ў нас праявілася некалькі негатыўных тэндэнцый: купля валюты перавышала яе продаж, азначыўся некаторы ператок з рублёвых укладаў у валютныя. Менавіта ў адказ на гэтыя праявы Нацбанк і зрабіў крок да ўзмацнення жорсткасці сваёй палітыкі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.07.2013 г.

Долар ЗША	8840,00	■
Еўра	11570,00	▲
Рас. руб.	271,50	▲
Укр. грыўня	1084,00	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 23°
Віцебск	+ 22°
Гомель	+ 21°
Гродна	+ 22°
Магілёў	+ 20°
Мінск	+ 22°

Міністр ЖКГ Андрэй ШОРАЦ:

Павышэнне тарыфаў заўсёды залежыць ад росту рэальнага заробку

У рэдакцыі газеты «Звязда» адбылася «прамая лінія» з міністрам ЖКГ Андрэем Шорцам. Ці будзе павялічаны нарматыў карыстання вадой? Колькі будзе каштаваць арэнднае жыллё? Куды ідуць нашы адлічэнні на капрамонт? Хто павінен спілаваць аварыйнае дрэва ў двары? Як прымусіць уласніка долі на кватэру плаціць сваю частку расходаў на камунальныя паслугі і рамонт? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў наш суразмоўца.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Яўгенія, г. Мінск:

— Я жыву ў арэнднай кватэры і плачу за карыстанне вадой па павышаным тарыфе. Аднак дагавор арэнды прадугледжвае, што на пэўны перыяд часу я набываю тыя ж правы, што і ўладальнік кватэры. Дык чаму мне не налічваюць плату за ваду па тым жа тарыфе?

— Вы атрымліваеце льготу па аплаце за ваду па тым адрасе, дзе зарэгістраваны. Сёння такая практыка ва ўсёй Беларусі, аднак вы — адзіная, хто ў мяне пра гэта пытаецца.

— Магчыма, я першая, але пытанне хвалюе не адну мяне — тэма мусіруецца ў СМІ, многія скардзяцца. Хацелася б, каб праблема была паднята на заканадаўчым узроўні.

— Я вывучу, наколькі гэта праблема вострая і якім чынам можна прасачыць прадастаўленне льготы чалавеку, які зарэгістраваны па адным адрасе, а пражывае па іншым.

— Можа, будзе павялічаны нарматыў карыстання вадой?

— Не, нарматыў павялічваць не будзем. Згодна са статыстыкай, у яго ўкладаецца 90% жыхароў краіны. З улікам таго, што сабекошт вады значна большы за льготны тарыф, нарматыў можа быць толькі зменшаны. У нас усе населеныя пункты, акрамя абласных цэнтраў, спажываюць значна менш вады, чым 140 літраў на чалавека. Сабекошт вады па асобных рэгіёнах зараз перавышае 8-10 тысяч рублёў за куб, вось і параўнайце з тым, колькі вы плаціце. СТАР.5

ВУЗКАПАЛАГА РАКА МОЖНА ЛАВІЦЬ

Лавіць вузкапалага рака дазволена ў Беларусі з 16 ліпеня.

Кароткачасовасць перыяду лоўлі вузкапалага рака абумоўлена асаблівасцямі віду. Для вынашвання ікры самцы патрэбна больш за паўгода. І лоўля падводных жывёл у іншы час магла б мець цяжкія наступствы для ўсёй папуляцыі.

У Беларусі норма вылаву вузкапалага рака складае не больш як 30 штук за суткі на аднаго чалавека. Адзін лавец можа адначасова выкарыстаць максімум тры пасткі. Прычым памер кожнай з іх не павінен быць больш як адзін метр, дыяметр уваходнай адтуліны — не больш як 70 см, ячэйкі не могуць быць менш як 22 мм.

Кар. БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СНОЎДЭН АФІЦЫЙНА ПАПРАСІЎ ПРЫСТАНІШЧА Ў РАСІІ

Былы супрацоўнік ЦРУ і АНБ Эдвард Сноўдэн, які на мінулым тыдні абвясціў пра жаданне прасіць у Расіі прыстанішча, у аўторак днём афіцыйна звярнуўся да ўлад з такім запытам.

«Я толькі што выйшаў з транзітнай зоны. Я дапамог яму аформіць заяву, і, паколькі ён не мог сам трапіць да прадстаўніка Федэральнай міграцыйнай службы, я папрасіў прадстаўніка прайсці да яго ў транзітную зону. Заява была афармлена і зарэгістравана ў транзітнай зоне», — заявіў старшыня камісіі Грамадскай палаты РФ адвакат Анатоль Кучэрэна. У Крамлі пакуль не каментуюць інфармацыю аб накіраванні Сноўдэнам запыту і адзначаюць, што рашэннем гэтага пытання будзе займацца адказная служба.

ЕЎРАПЕЙЦЫ ПЕРАСТАЛІ НАБЫВАЦЬ АЎТО

Зніжэнне продажаў легкавых аўтамабіляў у краінах Еўрапейскага саюза ў чэрвені 2013 года стала самым значным за 17 гадоў, перадаюць інфармагенцтвы. Па звестках Еўрапейскай асацыяцыі аўтавытворцаў (ACEA), у першай палове 2013 года ў ЕС было прададзена 6,2 млн новых машын, што на 6,6% менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Пры гэтым у чэрвені продажы ўпалі на 5,6%. Сярод найбуйнейшых рынкаў ЕС рост продажаў у мінулым месяцы быў зафіксаваны толькі ў Вялікабрытаніі (13,4%). Продажы ў Францыі знізіліся на 8,4%, у Германіі на 4,7%, у Італіі на 5,5%, у Іспаніі на 0,8%.

ПРАЦА Ў СТАРЭЧЫМ УЗРОСЦЕ ПАЛЯПШАЕ СТАН МОЗГУ

Так, кожны дадатковы год працы зніжае адпаведную рызыку на 3,2%, кажа Кэрал Дафуіл з даследчага агенцтва INSERM. Пра такую сувязь загаварылі пасля аналізу інфармацыі больш як 429 тыс. работнікаў (большасць — прадаўцы ці людзі рабочых спецыяльнасцяў). Сярэдні ўзрост складаў 74 гады, а тэрмін знаходжання на пенсіі — 12 гадоў. Амаль у 3% развілася дэменцыя. Але калі чалавек доўга працаваў, верагоднасць з'яўлення хваробы памяншалася. Так, сыходзячы на пенсію ў 65 гадоў, чалавек сутыкаўся са зніжэннем рызыкі на 15%, чаго не скажаш пра тых, хто не працаваў з 60 гадоў. Кэрал Дафуіл заклікаў чыноўнікаў дазволіць працаваць пажылым людзям столькі, колькі тыя захочуць.

ФМС ПРАПАНАВАЛА ЎЗАКОНІЦЬ ПЕРШАЧАРГОВАЕ ПРАВА РАСІЯН НА ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Федэральная міграцыйная служба лічыць неабходным абараніць першачарговае права расіян на працаўладкаванне. Пра гэта заявіў кіраўнік ведамства Канстанцін Рамаданаўскі. Паводле яго слоў, замежнікаў да незапатрабаваных вакансій варта было б дапускаць праз пэўны тэрмін, напрыклад, праз два месяцы. Рамаданаўскі лічыць, што такі механізм дазволіць зрабіць парадак працаўладкавання ў РФ празрыстым, а таксама дапаможа больш аператыўна рэагаваць на змены патрэб у кадрах. Кіраўнік службы прапанаваў выкарыстоўваць вопыт Еўрасаюза, дзе, паводле яго слоў, свабодныя працоўныя месцы займаюць спачатку жыхары рэгіёна. Пасля гэтага доступ да незапатрабаваных вакансій адкрываецца для жыхароў краіны, а затым — для замежнікаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ІСПАНІЯ ВЫБАЧЫЛАСЯ ПЕРАД БАЛІВІЯЙ

Іспанія прынесла прабачэнні за сітуацыю з самалётам прэзідэнта Балівіі Эва Маралеса ў Еўропе. Адпаведную дыпламатычную ноту ўручыў балівійскім уладам у Ла-Пасе пасол Іспаніі Анхель Васкес. «Іспанія глыбока шкадуе ў сувязі з гэтым фактам, — заявіў ён. — Нам шкада, што гэты інцыдэнт меў месца, мы прыносім нашы прабачэнні і тым самым лічым сітуацыю вычарпанай». Тым не менш, Балівійскія ўлады пакуль што не абвесцілі, ці прымаюць яны гэтыя прабачэнні. Самалёт, на якім прэзідэнт Балівіі вяртаўся на радзіму з маскоўскага Форуму краін-экспарцёраў газу 2 ліпеня, вымушаны быў здзейсніць незапланаваную пасадку ў Вене.

Гэта адбылося пасля таго, як некалькі еўрапейскіх краін — Іспанія, Францыя, Італія і Партугалія — адклікалі выдадзены самалёту дазвол на перасячэнне сваёй паветранай прасторы. Падставай для забароны паслужылі падазрэнні, што на борце прэзідэнцкага лайнера мог знаходзіцца былы супрацоўнік ЦРУ Эдвард Сноўдэн.

КОРАТКА

У Мінску з 20 ліпеня бягучага года ў сувязі з рэканструкцыяй трамвайнага пуці закрываецца трамвайны рух па праспекце Машэрава і вуліцы Старавіленскі тракт. Адначасова арганізуецца работа аўтобуса №903 «ДС Возера — Зм.Бядулі», у якім па 31 ліпеня 2013 года будуць дзейнічаць шматразовыя праязныя дакументы на трамвай на ліпень.

У Мінску з 16 ліпеня будзе кругласутачна праводзіцца масавая эвакуацыя аўтамабіляў, якія прыпаркаваны з парушэннямі ў цэнтральнай частцы горада. У асноўным гэта датычыцца вуліц Валадарскага, Інтэрнацыянальнай, Камсамольскай, Няміга і Караля.

Сістэмных адміністратараў і спецыялістаў па вытворчасці скуры і футра будуць рыхтаваць у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

Супрацоўнікі Брэсцкай мытні ўсяго з пачатку гэтага года 41 раз спынялі спробы незаконнага ўвозу мабільных тэлефонаў. У пунктах пропуску канфіскавана 750 мабільных тэлефонаў на суму Br2 млрд 012 млн.

ПРЫЁМ ДАКУМЕНТАЎ У ВНУ

Беларускія ВНУ другога патоку* з 16 ЛІПЕНЯ ажыццяўляюць прыём дакументаў ад абітурыентаў

ПРЫЁМ ДАКУМЕНТАЎ

БЮДЖЭТ:
на ўсе формы навучання - з 16 па 25 ліпеня;
на завочную і вячэрнюю формы**, калі не прайшлі на дзённую, - па 2 жніўня.

НА ЎМОВАХ АПЛАТЫ
на ўсе формы навучання:
з 16 ліпеня па 4 жніўня (пры падачы 3-х сертыфікатаў ЦТ);
з 16 па 25 ліпеня (пры падачы 1 (2-х) сертыфікатаў і ўнутраным(-ых) экзамене(-ах).

РЭЖЫМ РАБОТЫ ПРЁМНЫХ КАМІСІЙ ВНУ
панядзелак - субота, з 9.00 да 18.00

Прыёмныя камісіі ВНУ другога патоку будуць працаваць
У СУБОТЫ - 20, 27 ЛІПЕНЯ, 3 ЖНІЎНЯ
У НЯДЗЕЛЮ - 4 ЖНІЎНЯ (апошні дзень прыёму дакументаў на платнай аснове)
З 9.00 ДА 18.00

Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца кожны дзень не радзей як адзін раз за тры гадзіны работы прыёмнай камісіі:
У 9.00, 12.00, 15.00, 18.00
У апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне спыняецца ў 15.00

*ВНУ дзяржаўнай і прыватнай форм уласнасці, за выключэннем ВНУ МУС, МНС, Мінабароны, Дзяржпагранкамітэта і Мінкультуры.
**Акрамя ВНУ сельскагаспадарчага профілю.

Крыніца: Міністэрства адукацыі © Інфаграфіка БЕЛТА